*Ю.Ю. Захарына (Мінск)*

# БЕЛАРУСКАЯ АРХІТЭКТУРА САВЕЦКАГА ПЕРЫЯДУ ВА ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІМ КАНТЭКСЦЕ (1960 – 80-я гг.)

Узаемадзеянне разнастайных нацыянальных культур адбывалася на працягу ўсёй гісторыі [1, с.10]. Рысы стылістычнай агульнасці ў савецкі перыяд у многіх народаў былі абумоўлены падобнасцю сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця, якая выклікае складванне арганічна блізкіх мастацкіх форм. Пры гэтым на стылістычную агульнасць не ўплывалі разнастайная інтэрпрэтацыя матываў, індывідуальная трактоўка асобных дэталяў, адрозненні ў прыёмах уключэння дэкаратыўных элементаў у аздабленне. Гэта вызначыла падобнасць мастацкага вобраза ў дойлідстве Расіі, Украіны, Беларусі і іншых савецкіх краін.

У савецкія часы станаўленне мастацкага вобраза адбываецца пад уплывам сацыяльна-культурнага становішча дзяржавы, што спрыяе замацаванню агульных стылістычных тэндэнцый ва ўсіх савецкіх рэспубліках. Найбольшае развіццё атрымлівае тыпавое праектаванне, якое здзяйсняецца ў межах пануючага на той час мастацкага накірунку – функцыяналізму. Другім шляхам, які паклаў асновы фарміравання архітэктурна-мастацкага вобраза савецкіх краін, стаў зварот да нацыянальнай спадчыны, а таксама ўлік дасягненняў сусветнага дойлідства. Замацаванню наватарскіх рысаў садзейнічала вывучэнне дасягненняў сучаснай тэхнікі, на падставе якіх выпрацоўваліся новыя архітэктурна-будаўнічыя прыёмы, што замацоўваліся ў мастацкіх формах.

У сувязі з інтэнсіўным будаўніцтвам жылых масіваў на перыферыйных землях гарадоў Савецкай Расіі адбывалася пашырэнне гарадскіх межаў. Асноўным прынцыпам горадабудаўнічай кампазіцыі ў 60-х гг. XX ст. у Расіі становіцца сувязь буйных жылых масіваў з воднымі прасторамі і зялёнымі масівамі. Мацней за ўсё ў гэты час развіваюцца архітэктурныя традыцыі папярэдняга перыяду. Вобразная будова і канструкцыйна-тэхнічная аснова новых пабудоў адмаўлялі тую накіраванасць, якая выяўляецца ў тэктоніцы. Характэрнай рысай перыяду стаў зварот да

канструктывізму 20-х -30-х гг. XX ст., эстэтыка пабудоў была арыентавана на прыярытэт функцыі і канструкцыі над дэкаратыўным пачаткам. Адна з найбольш істотных супярэчлівасцяў наступнага дзесяцігоддзя заключалася ў тым, што тыпізацыя аб'ёмна-прасторавых вырашэнняў жылых і грамадскіх будынкаў прывяла да адсутнасці індывідуальнага пачатку ў кампазіцыі архітэктурных комплексаў. Пошукі архітэктурных вырашэнняў зліліся з жаданнем захаваць і аднавіць на новых асновах спецыфічныя рысы дойлідства гарадоў, знайсці сучасныя сродкі выразу нацыянальнага характару архітэктуры Расіі. Паступова ў 1970-х гг. узрастае значэнне ўзаемасувязі тэхнікі і архітэктурнай формы, дойлідства і прыроднага асяроддзя. У выніку асноўным падыходам была вызначана арыентацыя на імкненне да спалучэння сучасных архітэктурных форм з традыцыйнымі дэкаратыўнымі элементамі [2, с. 230-295; 3, с. 19]. Сярод асноўных фактараў, што паўплывалі на станаўленне мастацкага вобраза рэгіёна руска-беларускага памежжа, вылучаюцца сацыяльна-гістарычны, кліматычныя і прыродныя ўмовы, гандлёвыя сувязі.

Падобнае развіццё атрымала савецкая архітэктура беларуска-украінскага памежжа. У сярэдзіне XX ст. у вырашэнні фасадаў грамадскіх будынкаў Украіны ўжываецца вялікая колькасць зашклёных паверхняў, што тлумачыцца жаданнем дойлідаў арганічна звязаць інтэр'еры пабудоў са знешнім асяроддзем. Але ў большасці выпадкаў гэта прыводзіла да аднастайнасці архітэктурных вырашэнняў. Паступовы адыход ад тыпізацыі будаўніцтва сказаўся менавіта на вырашэнні фасадаў. У пачатку 70-х гг. XX ст. фасады грамадскіх будынкаў набываюць пэўную пластыку, у якой вялікую ролю адыгрываюць канструкцыйныя элементы. З гэтага часу больш распаўсюджанымі элементамі становяцца: абліцоўка сцен керамічнай пліткай, таніраванай цэглай, тынкоўка, ужыванне асбестацэментных лістоў, цэментных і бетонных абліцовачных пліт, рознакаляровая афарбоўка. Наданне мастацкай выразнасці забудове здзяйсняецца і з дапамогай добраўпарадкавання і азелянення тэрыторый [4, с.223; 5, с. 114-115]. Усё большае значэнне ў архітэктуры набывае праблема сінтэза мастацтваў [6, с.157].

Усе адзначаныя тэндэнцыі закранулі і дойлідства Савецкай Беларусі. Асновай беларускай архітэктуры ў гэты перыяд стала творчае засваенне лепшых традыцый рускага, украінскага і сусветнага дойлідства, выкарыстанне і развіццё прагрэсіўных прыёмаў і форм свайго нацыянальнага мастацтва. Адной з характэрных рыс беларускага савецкага дойлідства 1960-х - 80-х гг. з'явіўся яго горадабудаўнічы пачатак, што вызначыла станаўленне на шлях комплекснага ансамблевага будаўніцтва. Архітэктурная выразнасць новых архітэктурных кампазіцый забяспечвалася адпаведным размяшчэннем грамадскіх будынкаў, якія акцэнтавалі горадабудаўнічае значэнне таго ці іншага раёна горада, стылістычным адзінствам і аб'ёмна-прасторавым вырашэннем ансамбляў, добраўпарадкаваннем галоўных плошчаў, магістраляў і іншых гарадскіх вузлоў. У гэты перыяд адбылося адмаўленне ад традыцыйных горадабудаўнічых вырашэнняў, у аснове якіх ляжала супрацьпастаўленне цэнтраў ускрайкам. Павышанай увагай адзначаюцца пытанні сінтэзу архітэктуры і прыроды, сінтэзу мастацтваў [7, с. 191-193].

Развіццё дойлідства ў савецкія часы падпарадкоўвалася існуючым стылістычным накірункам, пераважна функцыяналізму. У межах склаўшыхся традыцый узнаўленне гістарычных форм у дойлідстве было прызнана недапушчальным. Рысы стылістычнай агульнасці савецкага дойлідства краін руска-беларуска-украінскага памежжа былі абумоўлены падобнасцю сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця. Адным з галоўных пытанняў горадабудаўніцтва адзначаецца сувязь з прыродным ландшафтам. У галіне сродкаў мастацка-вобразнай выразнасці найбольш значную ролю пачалі адыгрываць рэльеф і зялёныя насаджэнні. Пераемнасць гістарычных і нацыянальных традыцый паступова становіцца характэрнай рысай дойлідства. Асобная ўвага пачынае надавацца тэктанічным асаблівасцям, маштабу, прапорцыям, рытму як элементам формаўтварэння пабудоў. У вырашэнні праблемы эстэтычнага аблічча будынкаў галоўным становіцца пытанне дэкаратыўнага аздаблення фасадаў, якое грунтуецца на нацыянальных традыцыях.

1. Воинов А. Высшая архитектурная школа БССР и ее участие в развитии архитектурной науки в свете решений XXIV съезда КПСС и задач 9-й пятилетки // Архитектура и градостроительство. Доклады XXVIII научно-технической конференции. Апрель 1972 г. Мн., 1972. – С. 9 – 13.
2. Журавлев А.М. Архитектура Советской России. М., 1987. 447 с.
3. Архитектура Советской России / Под ред. Ю.С.Яралова. М., 1975. – 224 с.
4. Архитектура Советской Украины / Сост. И.Н.Седак, В.П.Дахно, Ю.И.Писковский, В.Е.Ладный. М., 1987. 303 с.
5. Архитектура Советской Украины / Под ред. В.П.Дахно. Киев, 1986. – 157 с.
6. Головко Г.В. Архитектура Советской Украинины. М., 1973. 158 с.
7. Архитектура и градостроительство Советской Белоруссии / Под ред. Ю.А.Егорова и А.П.Воинова. Мн., 1957. – 195 с.

*И.Ю. Клега (Мозырь)*

## СОЦИОКУЛЬТУРНЫЕ ТЕНДЕНЦИИ РАЗВИТИЯ МУЗЫКАЛЬНОЙ КУЛЬТУРЫ ГОМЕЛЬСКОГО ПОЛЕСЬЯ НА СОВРЕМЕННОМ ЭТАПЕ

Социально-культурная жизнь полесского топоса всесторонне отражает перемены, которые произошли в жизни людей за последние десятилетия. Своеобразный «творческий застой», возникший в первой половине 90-х годов в исполнительской и композиторской сферах (вызванный глубоким социально-экономическим кризисом в стране, преодолением последствий на ЧАЭС), на современном этапе развития сменился национально-культурным возрождением.

Позитивное влияние на развитие музыкальной культуры Полесья оказала демократизация жизни социума. Если в 70-80-е годы социокультурные работники были поставлены в жесткие рамки, регламентирующие направления, стили и методы художественно-музыкального выражения, то в конце 90-х годов сфера духовной жизни общества освобождается от идеологического диктата.

Культурная инноватика, ее актуализация, во многом связана с возрастанием роли технических средств и новых технологий в музыкальном творчестве. Активная модернизация технической базы повлекла за собой